ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.16 (3424) ● ● ЧАЦВЕР, 30 КРАСАВІКА, 2015

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Спявае “Журавачка” ў Кургане**
Вядомы беларускі гурт прыўносіць гармонію ў міжнацыянальныя адносіны ў расійскім Зауралли Стар. 2



**Тры лёсы пад вятрамі вайны**
Нататкі пра землякоў-беларусаў, якія цяпер жывуць у казахстанскім Усць-Каменагорску Стар. 3



**Вершамі жыве душа**
У Даўгаўпілскім Літоўскім доме прайшла вечарына да 175-х угодкаў Францішка Багушэвіча Стар. 4

СВЯТА

# Адзінства, якое натхняе

## Гала-канцэрт XII абласнога фэсту-конкурсу “Единство” прайшоў у Палацы культуры “Победа” гарадской акругі Самара

Фестываль, як вядома, заснаваны і праводзіцца Самарскай абласной грамадскай арганізацыяй беларусаў “Руска-Беларускае Братэрства 2000”, прымеркаваны да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Свята ўвасабляе даўнюю дружбу беларусаў і расіян, наша духоўнае сваяцтва. На гала-канцэрце лаўрэатаў фэсту ёсць і свае традыцыі, бачна і жаданне арганізатараў прыўнесці навізну ў сцэнічныя дзеі. Цікава назіраць за гэтым ростам! Фэст-конкурс дорыць новым удзельнікам радасць адкрыцця, потым — радасць пазнавання таго, што палюбілася раней. І — новыя адкрыцці штогод, бо бязмежныя энтузіязм і творчая фантазія стваральнікаў фэсту. А да свята далучаюцца ўсё новыя людзі, разнастайна таленавітыя. Часта на фэст-сцэне ўпершыню раскрываецца талент, каб потым свяціць ярчэй і ярчэй.



Фэст-конкурс “Единство” ладзіць самарская суполка “Руска-Беларускае Братэрства 2000”

Галоўная адметнасць фэсту сёлетняга — яго прысвячэнне 70-годдзю Вялікай Перамогі, агульнай для нашых народаў. Пра тое нагадала, адкрываючы гала-канцэрт, прэзідэнт “Руска-Беларускага Братэрства 2000” Ірына Глуская. Былі і іншыя згадкі пра суровыя выпрабаванні і подзвігі, што мацней паядналі нашы народы, у выступленнях паважаных асоб, у тым ліку з адміністрацыі губернатара Самарскай вобласці, мэрыі, абласнога Дома дружбы народаў, нацыянальна-культурных суполак. Удзельнікаў, гасцей і арганізатараў фэсту павіншавалі Пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка і Дзяніс Цімохін, кіраўнік аддзялення Пасольства Беларусі ў Уфе, якое курыруе Прыволжскую федэральную акругу, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Беларусі Міхаіл Рыбакоў. Ірына Глуская з радасцю адзначыла: фэст гуртуе ўдзельнікаў і гледачоў, робіць іх адзінай сям’ёй. І іншыя выступоўцы казалі, як важна традыцыі сяброўства перадаць юным. У тым залог мірнай будучыні народаў-братоў.

І вось на сцэне тыя, каму тую будучыню будаваць. Дзеці — светлыя, добрыя, таленавітыя. Побач з імі быццам глыбей успрымалася і мастацтва дарослых выканаўцаў. З самага пачатку настрой дабрыні, сардэчнасці злучае залу і выступоўцаў. На фэсце хораша гаварылі пра пачуццё радзімы, крэўную повязь са сваім родам, народам, яго гісторыяй, і што трэба памятаць, як жылі, чым праславілі сябе нашы продкі.

Адкрыла канцэрт Лізавета Глубінец (педагог Іна Сухачэўская): верш “Единство” прачытала яна з юнай шчырасцю, але глыбока і моцна. І гэта быў своеасаблівы мастацкі, эмацыйны камертон для іншых. Па-рознаму цікавыя былі выступленні Арыны Камісаравай, Анастасіі Гуркінай, Кацярыны Міхайлавай, Марыны Кірылавай, Даніла Аблыгіна (усе — таксама выхаванцы Іны Ігараўна з Цэнтра пазашкольнай адукацыі “Творчество”), а таксама Паліны Ягоравай (педагог Наталля Ганчарова). Гучалі фальклорныя песні, кампазіцыі, прысвечаныя памяці пра вайну. Насця Бындава (педагог Святлана Барсукова) здолела праспяваць “Хотят ли руские войны?” з кранальнай дзіцячай шчырасцю і чыстай, сур’ёзнай упэўненасцю. А Ксюша Плятнёва, выхаванка ЦПА “Творчество”, адна з самых юных удзельніц канцэрта, спявала “Катюшу” разам з вакалісткамі вядомага гурта “Каданс”. Атрымалася вельмі арганічна, эмацыйна ярка. → Стар. 2

ВЕСТКІ

## Сцежкамі памяці

Іван Іванаў

**Мерапрыемствы да 70-й гадавіны Вялікай Перамогі яднаюць ветэранаў і моладзь**

У Нацыянальнай бібліятэцы прэзентаваны зборнік “Радзіма. Адзінства. Перамога”, праект Выдавецкага дома “Звязда” і Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пад час імпрэзы гаварылі, што беларускія творцы і сёння звяртаюцца да ваеннай тэматыкі. Вайна закранула кожную сям’ю, а традыцыі нашай культуры такія: варта помніць і шанаваць подзвігі продкаў. У зборніку змешчаны апавяданні, нарысы і вершы беларускіх пісьменнікаў.

А нядаўна ў мінскім ліцэі №5 праходзіла сустрэча “Жыццёвае поле Алеся Савіцкага”. Пісьменнік-франтавік вёў дыялог з моладдзю пра мінулае і сучаснасць, пра свой ваенны досвед і агульную будучыню Бацькаўшчыны. Гэта была, дарэчы, першая з цыклу сумесных імпрэз Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і Саюза пісьменнікаў Беларусі “Дэсант Перамогі”. Цыкл прысвечаны 70-й гадавіне Вялікай Перамогі. Ураджэнец Полацка Алесь Савіцкі вайну сустрэў, закончыўшы 8 класаў. У 1942-44 гадах ён быў у партызанах на Віцебшчыне, потым ваяваў на фронце. Быў тройчы паранены, дайшоў да Берліна і пераможна распісаўся на сцяне Рэйхстага. Мае баявыя ўзнагароды. Пасля дэмабілізацыі працаваў журналістам, вучыўся ў Літінстытуце імя Горкага, аспірантуры, працаваў у Літаратурным музеі Якуба Коласа ды іншых месцах. Аўтар шэрагу аповесцяў, апавяданняў, у якіх закранае тэмы вайны. За раман “Верасы” і трылогію “Дзівосы Лысай гары” адзначаны Літаратурнай прэміяй Расіі “Прохараўскае поле” (2010).

ПЕРСПЕКТЫВЫ

# Доўгі шлях да зорак

Іна Ганчаровіч

**Адна з галоўных задач новай Нацыянальнай касмічнай праграмы, распрацаванай у Беларусі,— вывад на арбіту другога беларускага спадарожніка Зямлі**

Пра новыя касмічныя перспектывы, як і “касмічную гісторыю” Беларусі шмат гаварылася на прэс-канферэнцыі з нагоды Сусветнага дня касманаўтыкі. Удзельнічалі ў ёй кіраўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, прадстаўнікі шэрагу яе інстытутаў.

Сёлета — 58-я гадавіна касмічнай эры: савецкі “Спадарожнік-1” быў запушчаны на арбіту 4 кастрычніка 1957 года. Тады ж пачалася касмічная гонка звышдзяржаў, і беларускія вучоныя з першых дзён асваення космасу — актыўныя ўдзельнікі яе. У ліпені 2012-га на арбіту выйшаў першы беларускі касмічны апарат, што і пацвердзіла наша паўнапраўнае партнёрства ў касмічным элітным клубе. “Беларусь — невялікая краіна нават па еўрапейскіх маштабах, але канцэнтрацыя інтэлектуальных рэсурсаў у нас выключная, — адзначыў акадэмік Пётр Віцязь, кіраўнік апарата НАН Беларусі. — У даследчых цэнтрах, невялікіх у параўнанні з іншымі, але добра абсталяваных, працуе шмат найталенавітых людзей, здольных вырашыць самыя складаныя задачы”.

### Пачатак — у 1650 годзе

Згадаем касмічную гісторыю Беларусі. Яна пачалася, можна сказаць, у 1650 годзе: тады беларускі інжынер ад артылерыі Казімір Семяновіч першым прапанаваў ідэю шматступеньчатай ракеты. У XIX стагоддзі цікавасць да касмічнай тэмы праявіў выхадзец са Слуцка Вітольд Цэсарскі. Дзякуючы тэлескопу, створанаму пад яго кіраўніцтвам, былі адкрыты і апісаны серабрыстыя аблокі, аддаленыя ад зямлі на 80 кіламетраў, вызначана зорная велічыня Сонца і вылічана ніжняя рыса яго тэмпературы: 3500 градусаў па Цэльсіі. Імем Цэсарскага названа малая планета і кратэр на Месяцы. → Стар. 4



АЛЕНА СЯРОВА

Касмічны карабель “Союз ТМА-15А” ідзе на стыкоўку з МКС

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Спявае “Журавачка” ў Кургане

## Вядомы беларускі гурт прыўносіць гармонію ў міжнацыянальныя адносіны ў расійскім Заураллі


Кветкі для Л. Урванцавай, кіраўніцы суполкі “Батькавщина”

Іван Іванаў

Весткі пра святочныя імпрэзы з нагоды Дня яднання народаў Расіі ды Беларусі, якія ладзіліся з удзелам беларускіх суполак, прыйшлі ў рэдакцыю з розных рэгіёнаў Расіі. Кіраўніца Нацыянальнага культурнага аб'яднання беларусаў Зауралля “Батькавщина” Людміла Урванцава, у прыватнасці, даслала тэкст і здымкі з урачыстасці ў Курганскай абласной навуковай бібліятэцы імя Аляксея Югава. “На сустрэчы былі прадстаўнікі і адказныя работнікі Урада вобласці і горада, — піша Людміла. — Прыйшлі кіраўнікі рэгіянальных і муніцыпальных грамадскіх арганізацый, навуковыя работнікі і кіраўнікі ВНУ абласнога цэнтра, студэнты, кадэты і вучні школ горада”. Вітальнае слова ўдзельнікам урачыстасці накіраваў Губернатар вобласці Аляксей Какорын. У яго тэксце гаворыцца: свята сімвалізуе імкненне грамадзян братніх краін жыць у міры і дружбе, развіваць і ўмацоўваць шматбаковыя сувязі. Брацкія народы звязвае даўняя гісторыя, агульныя духоўныя каштоўнасці. Губернатар адзначае: Урад вобласці працягвае актыўнае ўзаемадзеянне з суполкай “Батькавщина” па захаванні і развіцці беларускай культуры, мовы і традыцый. Дарэчы, напярэдадні паміж камандамі з Кургана і Беларусі прайшоў валейбольны турнір, лік у якім атрымаўся сімвалічным — 2:2.

З віншаваннямі да ўдзельнікаў свята звярнуліся старшыня Саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Зауралля Сяргей Муратаў і старшыня гарадскога Савета ветэранаў вайнаў і працы Аляксандр Мазеін. Дырэктар Курганскага абласнога Цэнтра народнай творчасці Таццяна Абросімава адзначыла: з усёй Асамблеі народаў Зауралля беларуская суполка — самы актыўны ўдзельнік абласных конкурсаў і фэстаў. Сёлета, дарэчы, ансамблю беларускай песні “Журавачка” спаўняецца 10 гадоў, і Таццяна Вячаславаўна ўручыла артыстам Ліст падзякі “за ўнясенне гармоніі ў міжнацыянальныя адносіны”.

Ансамбль і на свяце парадаваў гледачоў песнямі. “Акрамя “Журавачкі”, выступілі ансамблі “Голас надежды”, “Светлячок”, сольна выконваліся аўтарскія песні, танцавалі дзеці”, — паведамляе Людміла Урванцава. Старшыня Савета Асамблеі народаў Зауралля Уладзімір Уфімцаў нагадаў: на тэрыторыі Курганшчыны жывуць прадстаўнікі розных народаў. Пра моцнае сяброўства з культурным цэнтрам беларусаў гаварыла кіраўніца Фонду культуры вобласці Людміла Серада-Аванесава.

Пра цікавасць моладзі да традыцый продкаў распавёў Уладзімір Ярушнікаў, прадстаўнік руху “Фолк — молодость”. Да руху далучаюцца тыя, хто цікавіцца славянскай культурай. На базе Курганскага дзяржуніверсітэта працуе гістарычна-этнаграфічны клуб “Славяне”: там вывучаюць стваральную культуру, абраднасць, ладзяць мерапрыемствы. У прыватнасці, у планах — правядзенне народных святаў Чырвоная горка, Тройца.

Кіраўніца суполкі “Батькавщина” Людміла Урванцава падзякавала ўсім, хто шануе традыцыі сяброўства народаў Беларусі і Расіі, павіншавала ўдзельнікаў урачыстасці са святам. Ад імя кіраўніцтва суполкі яна адзначыла актывістаў беларускага руху ў рэгіёне ганаровымі граматамі, падзячнымі лістамі, уручыла ім кветкі. У актавай зале бібліятэкі працавала выстава беларускіх кніг і вырабаў народных майстроў, умельцаў-беларусаў Зауралля. У зале гучалі вершы і песні на славянскіх мовах, і ўсе маглі пераканацца, наколькі слявянскія народы блізкія паміж сабой.

У дасланай з Кургана інфармацыі шмат спасылак на відэа, размешчаныя на інтэрнэт-партале youtube.com. Такім чынам карысны досвед курганскіх беларусаў становіцца даступным і для іншых суполак супляменнікаў у замежжы.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Было пра што расказаць...

**Актывістаў з суполкі “Уздым” запрасілі на сустрэчу з настаўнікамі адной са школ Даўгаўпілса**


Пры беларускім таварыстве “Уздым” плённа працуе творчы гурт “Пралескі”

Мы рабілі прэзентацыю беларускага таварыства “Уздым” у 3-й школе Даўгаўпілса. Там ёсць традыцыя: знаёміцца з этнасуполкамі, дайшла чарга і да беларусаў. А мы, як вядома, шмат увагі надаем пашырэнню беларускай культуры там, дзе жывём. Нам хочацца, каб людзі іншых нацыянальнасцяў маглі дакрануцца да багатай культуры, гісторыі, традыцый беларускага народа.

У актавай зале школы сабраліся настаўнікі. Як іх вітаць? Вырашылі пачаць з верша паэта Станіслава Валодзькі “Землякам”: у ім чуваць мелодыка нашай мовы. Намесніца старшыні суполкі Людміла Сінякова расказала, дзеля чаго створана таварыства. А я прадоўжыла аповед. Згадала, як ішло станаўленне суполкі, пра нашы творчыя гурты, якія радуюць талентамі гаражан Даўгаўпілса, жыхароў Латгаліі і замежжа. Больш падрабязна расказала пра “Беларускі кірмаш” — вялікую штогадовую імпрэзу, якая стала візітнай карткай Цэнтра беларускай культуры і таварыства “Уздым”. Расказваючы пра суполку, гаварылі мы і пра даваенную гісторыю жыцця беларусаў Латгаліі.

Потым спадарыня Зінаіда Сіліня, старэйшы сябар таварыства, цікава і эмацыйна знаёміла настаўнікаў з абрадавымі беларускімі песнямі: яна чула і спявала іх у дзяцінстве — спявае і цяпер. Вытокі тых песень — адзяе родных, бабулі і матулі. Зінаіда Іванаўна спявала ўрыўкі з розных твораў, а песню “Шэры конь”, гэта візітная картка спявачкі, выканала цалкам.

Далей Людміла Сінякова прадоўжыла аповед пра дзейнасць суполкі, пра знакамітых і таленавітых людзей, якія сваёй творчасцю ўпрыгожваюць жыццё ЦБК і “Уздыма” — гэта Анастасія Сазанкова, Валянціна Абушкевіч, Мікола Навуменка, Станіслаў Валодзька, Яўген Голубеў, Галіна Жалабоўская, Надзея Паўловіч, Павел Плотнікаў. Людміла расказала і пра ўдзел сяброў таварыства ў навуковых, краязнаўчых канферэнцыях як Латвіі, так і за яе межамі. Дзякуючы намаганням Людмілы створана маладзёжная група — гэта новы і цікавы рух у жыцці суполкі. Мы знаёмілі настаўнікаў з сайтам “Уздыма” і прапанавалі яго наведваць. Там знаходзяць адлюстраванне нашы справы, праекты. Дарэчы, прэзентуючы сайт, мы і фотаздымкі паказвалі з жыцця суполкі.

Настаўнікі даведаліся, што пры таварыстве “Уздым” працуе беларуская школа. Там вучні знаёмяцца з гісторыяй і традыцыямі беларусаў, на аснове гэтага і вывучаюць беларускую мову. Для іх праводзяцца і заняткі па прыкладным мастацтве. А настаўніца Таццяна Блізнакова праводзіць і музычныя заняткі, рыхтуе тэатральныя пастаноўкі. У суполкі ёсць сяброўскія сувязі з настаўнікамі школ з Беларусі (Магілёў, Гродна), з Беларускай асноўнай школай імя Янкі Купалы, якая працуе ў Рызе. У Цэнтры беларускай культуры ў нас адкрыта народная бібліятэка, у яе фондах — кнігі, сабраныя сябрамі таварыства “Уздым”. У рэалізацыі такога каштоўнага праекта нам паспрыялі супрацоўнікі Латгальскай цэнтральнай бібліятэкі. Гаварылі мы і аб праблемах інтэграцыі беларусаў у латвійскае грамадства.

Мы паказалі відэаматэрыялы пра Беларусь, падаравалі школе буклеты, часопісы, праспекты і кампакт-дыскі пра нашу Бацькаўшчыну. Дырэктар школы Віталь Азарэвіч падзякаваў нам за цікавую сустрэчу.

**Вольга Паўловіч, намесніца старшыні таварыства “Уздым”, г. Даўгаўпілс**

СВЯТА

## Адзінства, якое натхняе

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

І быў яшчэ “Вянок” з песень і танцаў, прысвечаных Перамозе — найважнейшая і адказная частка канцэрту. Усе выканаўцы розных узростаў здолелі “пражыць” свае нумары з поўнай душэўнай аддачай, жывымі пачуццямі. Гучала фартэпіянная версія “На безымянной высоте” ў выкананні юнай Соф'і Беланогавай (ЦПА “Творчество”), незвычайна кранальныя творы “Брестский трубач” (хор “Соловушка” са 101-й школы), “Песня наших отцов” (вакальна-інструментальны ансамбль “Весёлые нотки” 20-й дзіцячай музычнай школы). І былі лёгкія, з вуаллю смутку і шчасця танцы “Вальс Победы” (ансамбль народнага танца “Вдохновение” 36-й школы, кіраўнік Маргарыта Варанецкая), “Ах, эти тучи в голубом” (харэаграфічны гурт “Виктория” ЦПА “Творчество”). Песню “Смуглянка” малады спявак Аляксандр Марухаў з Самарскага абласнога вучылішча культуры і мастацтваў праспяваў так, быццам яна толькі што нарадзілася ў яго душы і люструе складаны, багаты ўнутраны свет. Спявалі артысты і пра каштоўнасці мірнага жыцця: кампазіцыі “Доброта” ў выкананні хору “Мечта” 101-й школы, “Должны смеяться дети” (ансамбль “Очарование” ЦПА “Творчество”).


Удзельнікі фэсту

Як заўсёды, былі прадстаўлены на фэсце і фальклорныя традыцыі братніх славянскіх народаў. Тэмпераментам і яркасцю фарбаў парадаваў фальклорны гурт “Весёлки” 7-й дзіцячай музычнай школы. Узорны харэаграфічны гурт “Диво” ЦПА “Поиск” паказаў веданне аўтэнтычных традыцый, з добрым густам ды на сучаснай мастацкай мове прадставіў іх гледачам. Стылізацыю на тэму беларускіх харэаграфічных традыцый паказаў ансамбль “Сюрприз” са 101-й школы.

І вось — урачыстае ўшанаванне ўдзельнікаў фэсту. Адзначылі і таленавітых выкладчыкаў, якія рыхтавалі выхаванцаў да ўдзелу ў ім. Асабліва пастаралася Іна Ігараўна Сухачэўская, яна ж і вядучая гала-канцэрта: яе вучні прадставілі дзясяткі нумароў фестывальнай праграмы. Затым былі ўручаны ўзнагароды артыстам. Гран-пры фэсту сёлета — у Веранікі Кузняцовай, вучаніцы Іны Сухачэўскай: на гала-канцэрце дзяўчына спявала песню “Баллада о матери”.

На заканчэнне — яшчэ прыемная навіна. Адну з песень праграмы гурт “Каданс” прысвяціў Ірыне Глускай — гэта было віншаванне яе з атрыманнем Губернскай прэміі ў галіне культуры і мастацтва за 2014 год. Ірына Міхайлаўна атрымала прэстыжную ўзнагароду за пашырэнне беларускай і рускай культуры ў Самарскай вобласці.

**Наталля Харытонава, г. Самара**

ПОМНІМ!

# Тры лёсы пад вятрамі вайны

## Нататкі пра землякоў-беларусаў, якія цяпер жывуць у казахстанскім Усць-Каменагорску

**У нашым горадзе ёсць Дом дружбы, пры ім — Беларускі этнакультурны цэнтр. Збіраюцца тут нашы суайчыннікі, дзеляцца ўспамінамі пра былое. Ёсць сярод іх і тыя, хто памятае ваенны час. Розныя дарогі вялі іх па свеце, а сустрэліся ўдалечыні ад Бацькаўшчыны — і як парадніліся. Пра некаторых старэйшых сяброў і хачу расказаць. Бо людзі ж не вечныя, а іх успаміны — каштоўныя для нашай супольнай беларускай гісторыі.**


Беларускі з Казахстана (злева направа) Н. Смельц, А. Сташко, Г. Жампеісава, А. Шчэмер

### Ніна Іванаўна Смельц

Мы пазнаёміліся ў 2011-м. Ніна Іванаўна расказала, што нарадзілася 9 снежні 1933 года ў Бабруйску, у сям'і кадравага афіцэра. Добра памятае дзень, калі пачалася вайна: "Яшчэ да абеду бацька прыехаў на грузавіку і загадаў маме хутка збіраць рэчы, дзяцей у дарогу — брацiку было 4 гады. На пытанне, куды і чаму мы едзем, тата адказаў маме: вайна!" З імі выехалі на вакзал і іншыя сем'і вайскоўцаў. Бацька пасадзіў родных у таварны вагон і развітаўся з імі. Назаўсёды... Па дарозе цягнік бамбілі, а ў Ваўкавыску (пэўна, састаў рухаўся з боку Гродна ці з Беласточчыны — на той час гэта была беларуская тэрыторыя. — **Рэд.**), згадвае субяседніца, яго зусім разбілі. Дзеці з маці неяк выбраліся з вагона, кінуліся ўроссып: ляцелі бомбы з нямецкіх самалётаў. Калі Ніна ачомалася, мамы нідзе не было, як і брата. Клікала, крычала... Прыбілася да людзей, ішла з імі. На нейкім хутары яе пакінулі. Добрыя людзі паклапаціліся пра дзяўчынку. Там і жыла ў вайну, па гэты час тым сялянам вельмі ўдзячная.

Пасля вайны яе аддалі ў Слонімскі дзіцячы дом. Пачалося іншае жыццё: вучоба, заняткі музыкай і спевамі. Яна з дзяцінства любіла спяваць. І ўвесь час шукала родных: маму Анастасію Іванаўну, тату Івана Дзмітрыевіча, брацiка Георгія. Толькі праз 10 гадоў маці сама знайшла яе. Ніна маці ўжо зусім не памятала, доўга да яе прывыкала. Аказалася, яны з братам выжылі, а бацька трапіў у палон, быў у Дрэздэнскім канцлагеры і памёр у 1945 годзе.

Маці з дзецьмі вярнулася ў Бабруйск, дзе дачка ў 56-м закончыла педвучылішча. Выйшла замуж за Роберта Смельца, працавала настаўніцай. У 59-м муж паехаў у Казахстан на заробкі, аказаўся ў Усць-Каменагорску. Праз год прыехала і яна, ужо з сынам. Выпадкова даведалася, што ў дзіцячы сад патрэбен выхавальнік. Пайшла туды, і сыну Сашку месца там знайшлося. Кажа: пашанцавала. Пазней паступіла ў музычную школу, за пяць гадоў навучылася граць на піяніна, стала ў дзіцячым садзе музычным кіраўніком. Там і працавала да пенсіі, да 1988 года.

У Казахстане ў сям'і нарадзіўся Вячаслаў. Сыны Ніны Іванаўны працуюць на свінцова-цынкавым камбінаце, маюць сем'і. Унучцы Яне 33 гады, унуку Арцёму — 18. Яны, а таксама праўнукі Даніла і Арсеній ведаюць пра свае беларускія родавыя карані. Радуецца, гледзячы на іх, мая субяседніца, ды шкадуе, што мужа ўжо няма на гэтым свеце. Ратуецца ад тугі, што часам падступае да сэрца, песнямі. Наведвае Дом дружбы, спявае ў фальклорным гурце "Крынічка" пры нашым цэнтры: гуртом кіруе выдатны музыка і чалавек Генадзь Кузьмін. "Тут сабраліся такія ж, як і я, "маладзіцы", — жартуе Ніна Іванаўна. — І нам разам вельмі добра! Часта бываем на мерапрыемствах Дома дружбы, цэнтра, горада. Жывем у згодзе, паважае адзін да другога. Вывучаем і беларускую мову, і казахскую. Беларусь у сэрцах заўсёды: чытаем вершы беларускіх паэтаў, спяваем нашы песні і заўсёды жадаем Бацькаўшчыне росквіту."

### Марат Віктаравіч Прышчэпчык

На пачатку вайны яму было 8 гадоў, сям'я жыла ў Баранавічах. "22 чэрвеня 1941 года ў 3 гадзіны 20 хвілін на горад наляцелі нямецкія самалёты-знішчальнікі і бамбавікі, — расказвае Марат Віктаравіч. — У горадзе было два ваенныя аэрадромы, немцы бамбілі і іх, і горад. Усе пахаваліся хто куды. Але часам мы, дзеці, выбягалі з хованак і назіралі, што адбываецца. Бачылі, што з нашых аэрадромаў узляцелі ўсяго два знішчальнікі, ды і тыя былі збітыя".

Дарослыя сабралі самыя неабходныя рэчы і пешшу з дзецьмі рушылі да горада Мар'іна Горка (прайсці трэба было кіламетраў 270), дзе жылі бабуля Марата, сваякі. Як толькі выйшлі на трасу, згадвае ён, то ўбачылі шмат разбітых машын: дарогу бамбілі фашысцкія самалёты. Вакол — целы загінулых салдат. Прайшлі кіламетраў 20, пачулі гул: нямецкія матацыклісты. Усе кінуліся ў кусты хмызняку. Зямляк помніць, як тады з лесу выехаў ЗІС, у кузаве стаялі два чырвонаармейцы. Хапалі гранаты са скрынь у кузаве і з крыкамі: "За Радзіму! За Сталіна!" кідалі ў ворагаў. Тыя падпалілі смельчакоў агнямётамі. І яшчэ ў адплату за страты вырашылі пастраляць у бежанцаў. "Адзін з фашыстаў падышоў і да нас і страляе, — хвалюецца Марат Віктаравіч. — Куля слізганула па маім ілбе... Я ўскочыў і закрычаў. Ён ускліknуў "О, кляйне кіндэр!" і адышоў. Потым фашысты падабралі сваіх забітых і паехалі. Мама апрацавала мне ранку спіртам, а ў бліжэйшай вёсцы яе зашылі."

Яны дабраліся да Мар'інай Горкі. Бацька Марата пайшоў у партызанскі атрад "Мсцівец", дзе камандзірам быў Цімафей Андрэевіч Фралоў, дзядзька хлопчыка. Маці стала сувязной: працавала тэхнічкай у нямецкай камендатуры і папярэджвала, калі рыхтаваліся аблавы на партызан. Потым прыйшло гора і ў іх сям'ю: бацька загінуў, прыкрываючы адыход падрыўнікоў ад чыгункі, а маці ў 43-м адправілі ў канцлагер "Дахау". Марат перабраўся ў атрад, і з братам Генам, сынам камандзіра, хадзіў хлопчык у разведку па вёсках. Прыносілі яны весткі, дзе стаяць немцы, а дзе паліцаі. Неяк зайшлі ў вёску двароў на 40. Фашысты і паліцаі тым часам даведаліся, што вяскоўцы дапамагаюць партызанам прадуктамі, напалі на людзей і павесілі на дрэвах 15 чалавек, сярод якіх жанчыны і дзеці. Хлопчыкам удалося ўратавацца.


Марат Прышчэпчык

Разведкі ў яго намяці — на ўсё жыццё. "Камандзір атрада даў заданне: трэба даведацца, што за ўзбраенне ў ворагаў, дзе яны спяць, — успамінае Марат Віктаравіч. — Мы з Генам узялі торбачкі, там па цыбуліне і кавалку хлеба. Ішлі як жабракі і прасілі міласціну. А самі ўважліва вывучалі, што патрэбна, запаміналі. Заўважылі, напрыклад, што ў адной вёсцы немцы спяць у школе, а паліцаі — у клубе, і ў іх ёсць танк. А нас заўважылі паліцаі. Спынілі, забралі торбачкі і павесілі на дрэва. Толькі паднімем рукі, каб зняць іх — страляюць. Так забаўляліся, пакуль не выйшаў немец і не аблаяў іх. Мы знялі торбачкі ды бягом адтуль. А ноччу партызаны знішчылі фашыстаў і іх паслугачоў, танк узарвалі. Вось так мы, дзеці, дапамагалі партызанам змагацца за родную Беларусь!"

Мінск вызвалілі 3 ліпеня 1944-га, а 16 ліпеня Марат з сябрам Генам былі на партызанскім парадзе, прысвечаным падзеі. Марат Віктаравіч гаворыць: "Цімафей Фралоў быў удзельнікам парада і ўзяў нас з сабою. Ён ішоў у калоне, а мы глядзелі. Пасля нас запрасілі ў рэстаран, узнагародзілі: дзядзька атрымаў грошы, а мы — пакункі з цукеркамі і банкі тушонкі. Радасці не было мяжы, гонар аж раздзіраў нас: мы ж таксама набліжалі Перамогу!"

### Антаніна Міхайлаўна Шчэмер

"Дзіця вайны" — называе сябе Антаніна Міхайлаўна. Нарадзілася яна ў 1937-м у вёсцы Краснае на Гродзеншчыне. Успамінае пачатак вайны: "Мама, я і старэйшая сястра нібы трапілі адразу ў пекла: лінія фронту побач. Перастрэлкі, аскепкі снарадаў, кулі, разрываюцца бомбы, пажары — усё помніцца, адбілася ў свядомасці. Адзін жахлівы страшны эпізод ніяк не магу забыць. У траўні 43-га фашыстам данеслі, што мужчыны нашай вёскі, па розных прычынах не мабілізаваныя, сышлі ў партызаны. За гэта пакінутых жыхароў фашысты вырашылі спаліць жыўцом. Усіх, у тым ліку і нас, карнікі сагналі ў вялікі хлеў на край вёскі. Вялікі жах у вачах маці, немы крык дзяцей помняцца па гэты час... Дзеці хапаліся за спадніцы маці і нема крычалі, а маці прыціскалі іх да сябе і плакалі наўзрыд. Фашысты штурхалі і штурхалі жанчын і дзяцей у хлеў. Мы, дзеці, яшчэ толкам і не разумелі, што будзе з намі, але здагадваліся, што нас чакае нешта страшнае".

На шчасце, немцы не паспелі падпаліць той хлеў. З'явіліся партызаны, пачалася перастрэлка. Жанчыны і дзеці штурхаліся, падалі адзін на аднаго, беглі хто куды. Некалькі чалавек проста затапталі. Антаніна помніць дзяўчынку: упала на маці, што сцякала крывёй, і гучна плакала. Пазней нямала жыхароў вёскі немцы павесілі і прымушалі ўсіх, у тым ліку і дзяцей, у навучанне глядзець на павешаных. Маці Антаніны старалася аберагаць дачок ад тых жахаў, ды не заўсёды ёй тое ўдавалася. "Памятаю, былі павешаны муж, жонка і іх васьмігадовы сын... — дрыжыць голас зямлячкі. — Нас гналі да таго месца і прымушалі глядзець, як яны гайдаліся... Мы ноччу потым не маглі спаць, мама доўга нас суцяшала... Цяжка было жыць у акупацыі: вопраткі не было, абутку ўвогуле ніякага. Нямецкія машыны з салдатамі часта праязджалі па вёсцы. Салдаты фатаграфавалі нас, напаўголых, мурзатых, знясіленых, і смяяліся. Па словах мамы, каб тыя здымкі паказваць у Германіі".

Антаніна Міхайлаўна памятае, як усю вайну дзеці 4-10 гадоў дапамагалі дарослым ва ўсім, часам выконвалі і непасільную працу, і тым набліжалі доўгачаканы дзень Перамогі. Разам з маці ўбіралі ўраджай, а снапы малацілі ўручную, капалі бульбу, даглядалі жывёлу. Увесну збіралі травы, шчаўе, карані розныя, пазней — ягады, грыбы, арэхі. А пад час перастрэлак і бамбёжак хаваліся ў скляпах. Пасля вызвалення Беларусі ад немцаў у 1944-м дзяўчынка пайшла ў першы клас. Галеча і голад, згадвае, былі паўсюль, бо, адступаючы, фашысты знішчалі і спальвалі ўсё.

Але ўсё ж паступова жыццё наладжвалася. У 1955-м яна закончыла школу, потым — медвучылішча, пачала працаваць акушэркай. У 1960-м прыехала ў Казахстан: хварэў старэйшы брат Антаніны, пасля заканчэння мединстытута накіраваны ў Усць-Каменагорск. Давялося яго даглядаць. Потым Антаніна паступіла ў Сяміпалацінскі мединстытут, які закончыла ў 1968 годзе. Два гады выкладала акушэрства ў медвучылішчы, затым пачала працаваць у радзільні, і 40 гадоў адпрацавала там акушэркай-гінеколагам. Стварыла сям'ю, мае сына і ўнучку. Антаніна Міхайлаўна гаворыць: "Я шчаслівая! Тут не грукочуць гарматы, не свішчуць кулі. Няхай заўсёды ўсміхаюцца нашы дзеці і ўнукі, хай ніколі не паўтораца жахі вайны!"

**Успаміны запісала Галіна Жампеісава, Усць-Каменагорск**

ПЕРСПЕКТЫВЫ

# Доўгі шлях да зорак

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Мінулае стагоддзе — пачатак беларускай касмічнай эры. Прызнаным класікам у галіне ракетных рухавікоў на пачатку веку стаў ураджэнец Слуцка Сямён Косберг, які стварыў рухавік для верхніх ступеняў ракет. З удзелам яго рухавіка, дарэчы, быў выведзены на арбіту першы штучны спадарожнік Зямлі і карабель з Юрыем Гагарыным. Пэўна, мала хто ведае, што пасля знакамітай фразы Гагарына "Паехалі!" была другая: "Косберг спрацаваў!".



БЕЛТА

Лётчыкі-касманаўты У. Кавалёнак, А. Навіцкі і П. Клімук на VI Беларускім касмічным кангрэсе

### Слуцкі фенамен

Слуцкая зямля ўвогуле багатая на спецыялістаў, так ці інакш звязаных з космасам. У 1918-м у вёсцы Сарогі на Случчыне нарадзіўся Канстанцін Герчык, другі начальнік (1958—61) першага ў свеце касмадрома "Байканур". Прымаў удзел у запусках першага спадарожніка Зямлі і касмічнага апарата да Месяца. Начальнікам касмадрома ў 1983-89 гадах быў случанін генерал Юры Жукаў. Пры ім было зроблена каля 400 запускаў ракет, з іх 15 — запускі экіпажаў, запуск шматразовага транспартнага касмічнага карабля "Буран" і касмічнай станцыі "МІР". Дарэчы, пры адвядзенні тэрыторый пад касмадром працаваў у Казахстане ў свой час Павел Атрушкевіч — ураджэнец вёскі Мархачоўшчына Стаўбцоўскага раёна, пазней вучоны, "правая рука" Нурсултана Назарбаева ў Асамблеі народа Казахстана, рэктар Казахскай дзяржаўнай архітэктурнабудаўнічай акадэміі (1987-99).

Сёння многія ведаюць пра беларускіх касманаўтаў Пятра Клімука, Уладзіміра Кавалёнка і Алега Навіцкага: ім удалося паглядзець на родную планету зверху, а Кавалёнак выходзіў у адкрыты космас. Родавыя беларускія карані ў першай жанчыны-касманаўткі Валянціны Церашковай: яна сама не раз пра тое гаварыла і пісала, і нават размаўляла ў дзяцінстве па-беларуску. Яе маці — з Дубровенскага раёна, а бацька — з-пад Магілёва. Другі раз на арбіце — з 24 лістапада 2014 года — працуе расійскі касманаўт з беларускімі каранямі (бацькі — з Быхаўскага раёна) Антон Шкаплераў: ён камандзір міжнароднага экіпажа карабля "Союз ТМА-15М", у складзе якога італьянка Саманта Крыстаферэці ды амерыканец Тэры Вёртс. Алег Навіцкі зноў рыхтуецца да экспедыцыі: старт прызначаны на канец лістапада 2016-га. Ёсць беларусы, якія прайшлі падрыхтоўку ў атрадзе касманаўтаў і паспяхова здалі дзяржэкзамены, але па розных прычынах, не залежных ад іх, у космас не паляцелі: напрыклад, ураджэнец Магілёўшчыны Барыс Белавусаў, з Гомельшчыны — Анатоль Дзядкоў і Аляксандр Шчукін.

### Космас адкрыты для таленавітых

Што да з'яўлення на арбіце новых беларускіх касманаўтаў, то гэта — справа часу. "Сёння ў шэрагу ВНУ Беларусі ёсць новыя спецыяльнасці, дзе рыхтуюць спецыялістаў для эксплуатацыі касмічных сістэм, — расказаў Сяргей Залаты, дырэктар прадпрыемства "Геаінфармацыйныя сістэмы" НАН Беларусі, галоўны канструктар Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандавання Зямлі. — Студэнты актыўныя ва ўсіх даследаваннях: ствараюць прыборы і нават пікаспадарожнікі (вагой да 2 кілаграмаў), забяспечваюць праграмнае суправаджэнне. Яны праходзяць навучанне пад кіраўніцтвам спецыялістаў, якія маюць досвед працы на касмадромах, вывучаюць дысцыпліны, якія раней не выкладаліся ў Беларусі. Большасць з іх вельмі таленавітыя хлопцы. І хто ведае, магчыма, з часам у Беларусі з'явіцца свой касманаўт".

НАН Беларусі заўсёды была ў касмічных справах на вышыні. "Работы па касмічнай тэматыцы пачаліся ў 1969-м, — расказаў акадэмік Валянцін Арловіч. — На той часу мы мелі добра развітыя вытворчасці "Пеленг" і "БелОМА", яны і цяпер — лідары аптычнага прыборабудавання. Нашы прыборы ляталі ў 4, 5, 7-м "Союзах", а савецкія касманаўты тады былі частымі гасцямі ў Інстытуце фізікі. Нашы фізікі-оптыкі пісалі нават з касманаўтамі сумесныя манаграфіі". З 70-х у Беларусі распрацоўваюцца і выпускаюцца прыборы і вузлы, датчыкі, спектрометры і... робіцца праграмы асваення Месяца. Дарэчы, першым месяцаходам з адлегласці больш за 350000 кіламетраў кіраваў наш зямляк, ураджэнец Слуцка штурман-навігатар Канстанцін Давідоўскі.

### БКА і "Канопус-У": адна арбіта для дваіх

На ўнікальным беларускім доследзе грунтавалася Першая нацыянальная касмічная праграма 2009-12 гадоў, яе вынік — запуск у 2012-м беларускага спадарожніка. Нагадаем, ён ужо другі: першы "БелКА", выраблены ў 2006-м пад кіраўніцтвам акадэміка Сяргея Жданка, не выйшаў на арбіту. Расійскі ракетаносьбіт "Днепр" выбухнуў пры старце, загінулі 18 спадарожнікаў, у тым ліку і беларускі. Але не спыніўся рух беларускіх вучоных да новых вышынь: БКА запушчаны амаль тры гады таму і паспяхова працуе ў пары з расійскім блізнюком-апаратам "Канопус-У". "Дзякуючы БКА створаны новыя, больш дакладныя і падрабязныя тапаграфічныя карты, наладжаны кантроль стану лясных рэсурсаў, праведзены аэракасмічныя даследаванні для вырашэння геалагічных задач, наладжаны маніторынг і ацэнка наступстваў прыродных і тэхнагенных катастроф, — расказаў Сяргей Залаты. — Па краіне заключаны дамовы з 11 міністэрствамі". Інфармацыя з БКА выкарыстоўваецца расійскімі міністэрствамі і ведамствамі. Падпісаны ўрадавыя пагадненні і створаны сумесныя прадпрыемствы з Раскосмасам, з Украінай. На чарзе — падпісанне пагадненняў з Казахстанам. З 2014-га Беларусь атрымала сяброўства ў Камітэце ААН па космасе і статус касмічнай дзяржавы, і гэта дасць магчымасць нашай краіне актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх пытаннях, якія тычацца сусветнага космасу.

На прэс-канферэнцыі гаварылі: ужо распрацавана новая Нацыянальная касмічная праграма, адна з галоўных задач якой — вывад на арбіту другога беларускага спадарожніка Зямлі. Ён будзе больш дасканалым, з аптычным дазволам (разрешением) 1 метр і паласой захопу тэрыторыі ў 40 кіламетраў. Такі апарат зможа канкураваць з аэрафотаздымачнымі комплексамі. Здымкі з беларускага спадарожніка плануюць прадаваць Расіі, ЗША, Канадзе, Кубе, Венесуэле і краінам Паўднёва-Усходняй Азіі. Як і спадарожнік БКА, ён стане часткай расійска-беларускай касмічнай групоўкі ды агульнай сістэмы дыстанцыйнага зандавання Зямлі. Так што беларуская касмічная адысея працягваецца.

РОДНАЕ

# Вершамі жыве душа

### У Літоўскім доме горада Даўгаўпілса прайшла вечарына да 175-х угодкаў Францішка Багушэвіча

Стваральнік літаратурнай мовы, дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння, паэт, пісьменнік, юрыст. Яго жыццё цесна спалучана як з Беларуссю, так і з Літвою — таму і ўшаноўвалі мы памяць земляка супольна з літоўцамі. "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!" — радкі паэта, ягоны духоўны запавет нашчадкам цяпер напісаны на фасадзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У гісторыю Бацькаўшчыны творца ўвайшоў і як актыўны ўдзельнік Польскага паўстання 1863-64 гадоў.

Будучы паэт нарадзіўся 21 сакавіка 1840 года ў Віленскай губерні, у збяднелай шляхецкай сям'і. Закончыў гімназію ў Вільні, а з Пецярбургскага ўніверсітэта яго выключылі за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Далей — Польскае паўстанне, раненне. Ён вымушаны быў жыць удалечыні ад роднай зямлі. Пасля царскай амністыі ў 1884-м Багушэвіч жыў у Вільні: працаваў адвакатам судовай палаты, вёў у асноўным справы сялян і гарадской беднаты. Пасля адстаўкі жыў у Кушлянах (цяпер Смаргонскі раён Гродзеншчыны), дзе памёр у 1900 годзе.

Паэтычная спадчына Багушэвіча — зборнікі "Дудка беларуская" (пад псеўданімам Мацей Бурачок) і "Смык беларускі" (пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава). Ён выступіў у абарону роднай мовы як мовы паўнапраўнай, "чалавечай і высакароднай", патрэбнай для выражэння любых думак і пачуццяў. Імем паэта названа плошча ў Мінску і Ашмянскі краязнаўчы музей, у Кушлянах ёсць Музей-сядзіба, у Смаргоні — бронзавы помнік. У Літве яго імя носіць бібліятэка, памятныя дошкі ўстаноўлены на доме ў Свіранах, дзе нарадзіўся, і ў Вільні на доме, дзе паэт пражыў 15 гадоў.



БЕЛТА

Адкрыццё помніка Ф. Багушэвічу ў Смаргоні

Кіраўнік Літоўскага дома Рымантас Клепшыс дапоўніў мой аповед фактамі з літоўскага перыяду жыцця Францішка Багушэвіча. Паэт Станіслаў Валодзька прачытаў верш па-беларуску, прысвечаны земляку. Вакальны гурт "Раса" выканаў песні на літоўскай, латышскай, беларускай і рускай мовах.

**Жанна Раманоўская, кіраўніца Цэнтра беларускай культуры**

АБРАДЫ

# Гульні продкаў

**Рыгор Арэшка**

### Пад Іркуцкам у чарговы раз справілі цікавы старажытны беларускі абрад

Маладзёжны клуб "Крывічы" абвяшчае Камаедзіцу беларускім святам абуджэння Мядзведзя. Заслугоўвае павагі, што супляменнікі шануюць народныя традыцыі ды праводзяць абрады на прыродзе. У прэс-рэлізе, дасланым у рэдакцыю, месца сустрэчы вызначана так: на Яршоўскай гары, на схіле паміж залівам Ангары і клубам "Дикая Лошадь".

Актывісты беларускай суполкі зладзілі свята больш чым на дзве гадзіны — з народнымі гульнямі, танцамі, карагодамі ды старадаўнімі песнямі: каму цікава — пішыцеім, падзеліцца досведам. Хлопцы-малойцы яшчэ ж і барукаліся па-мядзведжы. І таму Алег Рудакоў, дасылаючы пасля абраду здымкі, заўважыў: ох, яшчэ ныюць костачкі пасля тых вясёлых гульняў-забаў...

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1930, **Заказ:** 626
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2015